Гейкер Я.

# З КАГОРТЫ АДВАЖНЫХ

**"Здаецца просты чалавек, а прыйдзе суровая бяда і... узнімецца ў ім вялікая сіла"**

**А. Талстой**

## ЁН НЕ БЫЎ ПАЙ-ХЛОПЧЫКАМ

– Зноў Сёма кудысьці знік, – скардзілася мужу Эстэр, маці сямігадовага Саламона. – Толькі што гуляў у двары – і на табе! І брамку зачыніла на замок – наўкол жа поўна белапалякаў і рознага хуліганне. Відаць, пралез пад брамкай. І дзе яго толькі носіць? Хаця б усё абышлося добра...

– Быццам упершыню такое здараецца, – супакойваў жонку Арон Іолевіч. – Гэта ж гарэза несусветная, малы, а нічога і нікога не баіцца...

– Увесь у цябе пайшоў, – ці то з дакорам, ці то з гордасцю за мужа заўважыла Эстэр. І спытала. – А ты шмат баяўся, калі ўступаў у сацыял-дэмакраты і цябе арыштоўвалі за падпольную друкарню?

– І ты ж не з палахлівага дзесятку, – падначыў жонку Арон Іолевіч. – Памятаеш, як за ўдзел у самадзейным спектаклі супраць цара ты трапіла пад нагляд паліцыі? Хлопчык ўзяў тое-сёе ад нас абодвух.

Эстэр заставалася толькі моўчкі ўздыхнуць.

А Сёма, як ласкава называлі ў сям'і бабруйчан гарбарніка Арона і швачкі Эстэр Гарэлікаў малодшага з дзяцей, Саламона, у гэты самы час знаходзіўся зусім у іншай частцы горада і з цікавасцю прыглядаўся да ўсяго новага для сябе. Не звяртаў ён аніякай увагі на польскіх легіянераў, што шасталі на вуліцах. Аднаму толькі Богу было вядома, як малы не загубіўся і знайшоў дарогу дамоў.

Калі вярнуўся, не таячыся, расказаў бацькам, дзе быў, пра свае "прыгоды". Арон і Эстэр ведалі, што ён ніколі не схлусіць, не пачне выкручвацца, хітрыць. Таму і вельмі рэдка каралі сына.

У школьныя гады хлопчык не вызначаўся ўседлівасцю, хаця, па словах настаўнікаў, быў здольным вучнем. Затое любіў штосьці майстраваць, разбіраць і збіраць гадзіннікі, замкі, веласіпеды. У адзінаццаць гадоў мог ухіліць любую няспраўнасць у электраправодцы. Калі патрабавалася штосьці адрамантаваць, суседзі звярталіся да хлопца.

А сярод таварышаў ён славіўся адчайнай смеласцю і кемлівасцю, настойлівасцю і справядлівасцю. Мог адстаяць сябе нават перад тымі, якія былі старэйшымі і дужэйшымі за яго. Не даваў у крыўду і сяброў.

## РУКІ ПРОСЯЦЬ СПРАВЫ

– Буду паступаць у рамеснае вучылішча, – заявіў аднойчы бацькам Саламон. Тыя ад такога "сюрпрыза" атарапелі:

– Ты што, у сваім розуме: школу ж не скончыў, куды пойдзеш? – спытаў бацька.

– У школе ёсць прадметы, якія мне зусім непатрэбныя, – растлумачваў хлопец. – Хачу хутчэй асвоіць рабочую прафесію.

Ніякія ўгаворы бацькоў, старэйшых сёстраў і настаўнікаў не дапамаглі.

Тут, у майстэрнях вучылішча, ля станкоў ён адчуў раздолле для сябе. Выдатна вучыўся, настаўнікі і майстры вельмі хвалілі свайго вучня, расказвалі бацькам, што ён усё схоплівае зналёту.

Скончыўшы вучылішча, Саламон уладкаваўся на чыгуналіцейным заводзе (зараз машынабудаўнічы завод імя У. І. Леніна) токарам-інструментальшчыкам. Яму даручалі самыя адказныя заданні. Апрача сваёй спецыяльнасці юнака вабіла тэхніка фатаграфавання, і ён стварае на прадпрыемстве невялікую фотастудыю.

Але з цягам часу юнак адчуў, што яго не задавальняе застарэлае абсталяванне, з якім ён меў справу, і вырашыў папрацаваць на адным з буйных прадпрыемстваў Ленінграда, аснашчаным навейшай тэхнікай. Балазе, у горадзе на Няве працаваў брат і вучыліся дзве яго сястры.

На новым месцы Саламон сурёзна павысіў сваю кваліфікацыю, а працавітасцю і дапытлівасцю заваяваў павагу ў старых рабочых і любоў у маладых.

## З ЛЁТЧЫКАЎ – У ТАНКІСТЫ

Калі ў 1932 годзе быў аб'яўлены набор ленінградскай моладзі ў мясцовую авіятэхнічную школу, адным з першых падаў заяву аб залічэнні ў яе Саламон Гарэлік. Вучоба давалася яму лёгка. Далі сябе ведаць любоў да тэхнікі і вопыт, атрыманы на заводзе.

Да заканчэння вучобы застава лася ўжо нямнога часу. Маладому курсанту мроіліся па начах аэрадромы, самалёты, ангары. Але аднойчы курсантаў нечакана выстраілі на плацу, і начальнік школы паведаміў, што на ўзбраенне Чырвонай Арміі паступаюць новыя танкі ТБ-4. А на іх стаяць авіяцыйныя маторы. Патрэбныя спецыялісты для эксплуатацыі і рамонту новых машын, галоўным чынам іх рухавікоў. Таму вырашана перакваліфікаваць курсантаў, накіраваўшы іх для гэтага ў тэхнічнае танкавае вучылішча.

І зноў пацяклі дні напружанай вучобы. Курсанты вывучалі матэрыяльную частку танкаў, тактыку і спосабы вядзення танкавага бою. Як і ў авіятэхнічнай школе, юнак звярнуў на сябе ўвагу сваёй кемлівасцю, здольнасцю выключна хутка заўважаць любыя няспраўнасці ў рабоце механізмаў. Нарэшце прыйшоў дзень, калі разам з іншымі курсантамі Саламон апрануў форму ваентэхніка другога рангу танкавых войскаў. Яго накіравалі ў танкавую часць, якая дыслацыравалася ў Паўлаўску, пад Ленінградам. Як выдатніку баявой і палітычнай падрыхтоўкі, новаспечанаму ваентэхніку быў

прадастаўлены водпуск, які ён выкарыстаў для паездкі дамоў у Бабруйск. Менавіта тады ў жыцці Саламона адбылася вельмі важная падзея: ён ажаніўся на сяброўцы дзяцінства Шуры Валовіч, і яна пераехала на месца службы мужа.

Яму аднаму з лепшых тэхнікаў-танкістаў Ленінградскай ваеннай акругі, у 1938 годзе быў аказаны гонар удзельнічаць у ваенным парадзе на Чырвонай плошчы ў Маскве.

Савецка-фінская вайна 1939 года дала яму магчымасць прымяніць свае веды і вопыт, набыты ў час ваеннай вучобы, ва ўмовах рэальнага бою. Ён транспарціраваў з фронта і накіроўваў на Кіраўскі завод пашкоджаныя машыны для рамонту. У час адной з такіх аперацый танк, які вёў ваентэхнік, быў падбіты, загарэўся, і Саламон ледзь паспеў выскачыць з яго.

Вайна з фашысцкай Германіяй напаткала Гарэліка ў Львове, куды ён быў пераведзены і прызначаны памочнікам начальніка курсаў удасканалення каманднага саставу. У той час на ўзбраенне нашай арміі пачаў паступаць новы танк Т-34, які па праву заваяваў на палях бітваў славу лепшага танка другой сусветнай вайны. Адным з першых асвоіўшы яго, ваентэхнік перадаваў свой вопыт камандзірам-танкістам.

У першыя дні гітлераўскага нашэсця Гарэліка прызначаюць намеснікам камандзіра танкавай роты па тэхнічнай частцы толькі што створанай 1-й асобнай танкавай брыгады (потым гвардзейскай Рэзерва Галоўнага Камандавання), якой камандаваў палкоўнік А. М. Хасін. Саламон Гарэлік удзельнічаў у абарончых баях за Жытомір, Бердзічаў, Кіеў. Пад агнём праціўніка перапраўляў падбітыя савецкія танкі ў палявыя майстэрні і пасля рамонту вяртаў на перадавую, нярэдка на месцы ўхіляў пашкоджанні і асабіста выпрабоўваў у баі. Пры неабходнасці прымаў на сябе абавязкі камандзіра баявой машыны.

## ПЕРШАЯ ПЕРАМОГА

...Стаяла пахмурная, дажджлівая восень сорак першага года. Чырвоная Армія пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка, асабліва ў авіяцыі і танках, адыходзіла на Усход. Нямецкая танкавая групоўка прарвалася ў раён сяла Штэпаўка Сумскай вобласці. Як піша ў сваіх мемуарах маршал Савецкага Саюза І. Х. Баграмян, які з'яўляўся тады начальнікам аператыўнага аддзела Паўднёва-Заходняга фронта, пазіцыі 5-й кавалерыйскай дывізіі былі прарваны, і фашысты рынуліся да штаба 2-га кавалерыйскага корпуса. Варожыя танкі расстрэльвалі штабныя машыны. Штабісты і байцы на чале з камандзірам корпуса генералам П. А. Бяловым занялі кругавую абарону і з усіх сіл адбіваліся. Становішча стварылася адчайнае. На выручку рушыла хасінская танкавая брыгада. Завязаўся вельмі жорсткі бой. Нават нашыя, ахутаныя полымем, трыццацьчацверкі, несліся па полю бою, знішчаючы праціўніка. Частка нямецкіх танкаў з-за адсутнасці

гаручага пазбавілася магчымасці прасоўвацца далей. І гэтай акалічнасцю ўмела скарысталіся савецкія танкісты.

...Грозная машына, якую вёў Гарэлік, імчалася наперадзе роты. Супрацьтанкавая батарэя праціўніка абрушыла на галаўны танк шквальны агонь. Экіпаж Т-34 уступіў з ёю *ў* смяротны паядынак. На шалёнай хуткасці танк уварваўся на хаду ў размяшчэнне варожай батарэі. Удар – і адна з гармат ператварылася ў груду металу, яшчэ рывок – і раздаўлены другая, а затым – трэцяя і чацвёртая. Такі ж лёс напаткаў шэсць мінамётаў.

У выніку рашучых баявых дзеянняў нашых танкістаў, а таксама воінаў 1-й стралковай дывізіі палкоўніка І. Н. Русіянава, якая праславілася яшчэ ў баях пад Мінскам і Ельняй, і першай у нашай арміі атрымала званне гвардзейскай, і 1-га кавалерыйскага корпуса праціўніку быў нанесены адчувальны ўрон. Пад Штэпаўкай знайшлі сабе магілу 8000 нямецкіх салдат і афіцэраў, на полі бою засталіся 70 падбітых і падпаленых танкаў з чорнымі крыжамі, 150 гармат, 5 мінамётных батарэй.

Перамога пад Штэпаўкай была атрымана ў абстаноўцы агульнага адыходу нашых войскаў і таму мела важнае палітычнае і маральнае значэнне. Вядомы савецкі паэт Аляксандр Безыменскі напісаў "Песню аб Штэпаўцы", якая заканчвалася словамі:

Стереть не сумеют любые года
Октябрьский тот бой величавый,
И песня о Штеповке будет всегда
Былиной геройства и славы.

## ЗАМЯНЯЮЧЫ КАМАНДЗІРА

Некалькі дзён працягваліся кровапралітныя баі за горад Багадухаў, што на Харкаўшчыне. У многіх танкавых экіпажах страты складалі палавіну саставу. Калі пасля рамонту некалькіх машын высветлілася, што на адной з іх не хапае камандзіра, Гарэлік вырашыў замяніць яго і захлопнуў за сабой крышку люка.

– Уперад! – аддаў загад ваентэхнік. Вадзіцель націснуў на старцёр, і танк рушыў насустрач ворагу.

Гулкі гарматны стрэл успароў цішыню, за ім другі, трэці. Гэта гітлераўцы пачалі біць па нашай машыне.

– Разварот управа! Даві батарэю фрыцаў! – скамандаваў ваентэхнік.

У глядзельных шчылінах мігалі быццам выхапленыя з фільма кадры: скалечаныя варожыя гарматы, скажоныя страхам твары артылерыстаў і пехацінцаў. Чутны скрыгатанне металу, пранізлівыя крыкі... Без стомы паварочваецца танкавая вежа, няспынна б‘е гармата. У гарачыні бою экіпаж не прыкмеціў, што танк адарваўся ад астатніх машын. Але ў глядзельныя прыборы было відаць, як, натхнёныя прыкладам бясстрашнага экіпажу, за ім паімчаліся астатнія.

У гэтым баі танк ваентэхніка знішчыў восем гармат, тры мінамёты і некалькі кулямётных гнёздаў.

## АПОШНІ БОЙ

У другой палавіне кастрычніка буйныя сілы фашысцкіх танкавых войскаў выйшлі да старажытнага рускага горада Белгарада. Камандаванне Паўднёва-Заходняга фронта паставіла задачу затрымаць прасоўванне праціўніка, каб даць магчымасць нашым часцям адыйсці на новы абарончы рубеж. Вялікія надзеі ўскладаліся на 1-ю танкавую брыгаду. У гэтых умовах важна было захаваць у баявым стане кожны савецкі танк. Кіраўніцтва рамонтам баявой тэхнікі было ускладзена на С. Гарэліка. І ў самыя крытычныя моманты ён не падводзіў.

Рашаючы бой разгарэўся 23 кастрычніка, у пяці кіламетрах ад Белгарада, ля сяла Стралецкага. Наперадзе роты, уздрыгваючы ад бесперапыннай стральбы, імчаўся Т-34, якім камандаваў у той дзень Гарэлік. Ён замяніў намесніка палітрука роты Фёдара Самахвалава, што загінуў учора. Гітлераўцы адкрылі па баявой машыне шквал агню з супрацьтанкавых гармат і мінамётаў, білі па ёй і фашысцкія танкі. Гарэлік накіраваў свой сухапутны "крэйсер" у баявыя парадкі немцаў. Т-34 апракідваў і давіў гусеніцамі варожыя гарматы, мінамёты, аўтамашыны, знішчаў пяхоту. Былі падпалены два непрыяцельскія танкі.

Раптам ад страшэннага ўдару трыццацьчацвёрка ўся ўздрыганулася. У яе трапіў супрацьтанкавы снарад. Заглох матор. Аднак вежа танка няспынна паварочвалася ў розныя бакі, і з гарматы адзін за адным на немцаў несліся снарады. Амаль дзве гадзіны працягваўся няроўны і безнадзейны паядынак, пакуль не скончыліся боепрыпасы. Немцы шчыльным кальцом акружылі нерухомую машыну, якая толькі што наносіла ім вялікую шкоду. На прапанову здацца экіпаж адказаў маўчаннем. Як ні чакалі ворагі, але люк савецкага танка так і не адчыніўся. Якое ж было здзіўленне немцаў, калі, прыслухоўваючыся, яны пачулі праз браню гукі "Інтэрнацыянала". Тады фашысты аблілі танк бензінам і падпалілі. Праз некалькі імгненняў яго ахапіла полымя. Густы дым ахутаў танк унутры. Цяжка стала дыхаць. Задыхаючыся, сцяўшы зубы ад болю, які выклікалі вострыя апёкі, танкісты спрабавалі збіць полымя рэчавымі мяшкамі, чахламі. Тлелі, загараліся целагрэйкі. Танкісты кідалі іх, тапталі нагамі зноў змагаліся з агнём. Полымя адступала на нейкае імгненне, але разгаралася зноў...

Экіпаж машыны аддаў перавагу смерці перад фашысцкім палонам.

Двойчы прыходзілі восенню сорак першага гаротныя весткі ў дом бацькоў ваентэхніка, якія былі эвакуіраваны з Ленінграда, куды яны пераехалі перад вайной, у сібірскі Омск. У пачатку кастрычніка на Пулкаўскіх вышынях, што пад Ленінградам, загінуў іх старэйшы сын, 36-гадовы Іосіф – вучоны-металург, які добраахвотна пайшоў у народнае апалчэнне. А праз дзевятнаццаць дзён не стала і Саламона.

Застаецца толькі здзіўляцца, што, нягледзячы на неаднаразовыя пажаданні грамадскасці Бабруйска, у прыватнасці, ветэранскай арганізацыі нашага горада, імя героя-бабруйчаніна на яго радзіме нічым не ўвекавечана.

**СЯМ'Я ГЕРОЯ**

Пасля вайны бацькі Саламона вярнуліся з эвакуацыі ў Ленінград, дзе і памерлі. Яго жонка Аляксандра Аляксандраўна разам з дачкой Кансуэлай і сынам Эдуардам перажылі ленінградскую блакаду, а пасля вайны вярнуліся ў Бабруйск. Яна працавала касірам у адной з арганізацый. Іграла на сцэне народнага драматычнага тэатра клуба мясцовай прамысловасці (зараз гарадскі Дом культуры), у многіх спекгаклях выконвала цэнтральныя ролі. Адзінаццаць гадоў таму Аляксандра Аляксандраўна памерла.

У Бабруйску жыве дачка героя, 64-гадовая Кансуэла (па мужу Калініна). Да выхаду на пенсію яна працавала швачкай у атэлье, потым бухгалтарам на фанера-дрэваапрацоўчым камбінаце. Муж Кансуэлы, Іван Рыгоравіч, да пенсіі працаваў тэхнікам-эксплуатацыйнікам у транспартных арганізацыях. У іх два сыны, тры ўнукі і ўнучка. Брат Кансуэлы, Эдуард – слесар-інструментальшчык вышэйшай кваліфікацыі, шмат гадоў прапрацаваў на тым жа прадпрыемстве, што і бацька – машынабудаўнічым заводзе імя У. І. Леніна.

Сястра танкіста Фаіна па прафесіі інжынер, другая сястра Люба – тэхнік. Да апошніх гадоў абедзве жылі ў Пецярбургу.

Вось і ўсё, што можна ў некалькіх словах распавесці пра лёс сям'і героя.

**Гейкер, Я. З кагорты адважных / Яфім Гейкер // Бабруйскае жыццё. — 2000. — 30 мая. — С. 2.**